УДК 902(476.5)«16/17»

# ВОПЫТ ВЫВУЧЭННЯ АКТАВЫХ КНІГ МАГІСТРАТА І АРХЕАЛАГІЧНЫХ ПОМНІКАЎ ПОЛАЦКА XVII–XVIII стст.: ПРАБЛЕМЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

*Дук Дзяніс Уладзіміравіч*
прафесар кафедры археалогіі, гісторыі Беларусі і спецыяльных гістарычных дысцыплін установы адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова",
доктар гістарычных навук, прафесар
(г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь)

*Вызначаецца эўрыстычны патэнцыял дзвюх асноўных груп крыніц у справе далейшага вывучэння матэрыяльнай спадчыны Полацка XVII–XVIII стст. – пісьмовых і археалагічных. Пазначаны магчымасці кожнай з груп, шляхі іх пашырэння і вызначаны прыярытэт археалагічных крыніц у папаўненні крынічнай базы.*

У дадзеным артыкуле будзе разгледжаны эўрыстычны патэнцыял гістарычных крыніц у справе спасціжэння віталітыўнай культуры насельніцтва Полацка: гарадской прасторы і забеспячэння жыцця людзей, іх побыту, заняткаў і ўяўленняў. У прапанаваным кантэксце разгледзім дзве асноўныя групы гістарычных крыніц – пісьмовыя і археалагічныя і на іх падставе паспрабуем вызначыць, якія патэнцыйныя магчымасці даюць тая ці іншая група ў рэканструкцыі не самай аддаленай у часе рэальнасці XVII–XVIII стст.

Археалагічныя крыніцы па дадзенаму перыяду прадстаўлены ўсімі асноўнымі групамі артэфактаў: нерухомымі і рухомымі, пры гэтым колькасна і якасна яны дастаткова ўнушальныя. Пісьмовыя крыніцы таксама вельмі інфарматыўныя, але не поўныя па прычыне страты большай часткі актавых кніг полацкага магістрата па перыяду XVII ст. [1, с. 10]. Звернем увагу на патэнцыял абедзвюх груп крыніц.

У групе археалагічных крыніц найлепш прадстаўлены катэгорыі рухомых артэфактаў. З нерухомых аб'ектаў бракуе звестак аб аб'ектах інфраструктуры, найперш мастоў праз рэкі Заходняя Дзвіна і Палата. Няма даных аб знешнім выглядзе і асаблівасцях галоўных адміністрацыйных будынкаў і спецыялізаваных пабудоў – архітэктурнага комплекса полацкай ратушы, "паспалітай лазні", крамаў і ятак на "месцкім" рынку, абарончых пабудоў. Няма археалагічных звестак аб канструкцыях сродкаў перамяшчэння – чоўнаў і вазоў. Звесткі пісьмовых крыніц даюць пэўныя ўяўленні аб іх, але далёка не поўна, і для гістарычных рэканструкцый прыходзіцца прымяняць гісторыка-параўнаўчы метад. Акрамя таго, практычна няма археалагічных сведчанняў аб знешнім выглядзе і перабудовах галоўных культавых будынкаў Полацка – Сафійскага сабора да Паўночнай вайны, Пятніцкай і Барысаглебскай цэркваў Барысаглебскага манастыра. Не вызначаны асаблівасці архітэктурна-планіровачнага развіцця буйнейшага Барысаглебскага манастыра ў Полацку. Напрыклад, у пісьмовых крыніцах існуюць звесткі аб наяўнасці абарончых умацаванняў манастыра (!), адпаведна, можна ставіць пытанне і аб магчымым абарончым прыстасаванні манастырскіх храмаў у XVII ст. Са згаданых помнікаў культавага дойлідства найбольш "аптымістычнай" з'яўляецца перспектыва даследавання Пятніцкай царквы Барысаглебскага манастыра – яна, згодна з нашымі археалагічнымі даследаваннямі, цалкам захавалася на ўзроўні падмуркаў. Тое ж тычыцца і галоўнага сабора таго ж манастыра, падмуркі і частка сцен якога па-ранейшаму прадстаўляюць выдатную магчымасць для археалагічных даследаванняў. Падмуркі Барысаглебскай царквы, як паказалі вынікі нашага археалагічнага нагляду, былі практычна цалкам разбураны ў XX ст. Магчымыя перабудовы Сафійскага сабора ў XVI–XVII стст. практычна не закранalі яго падмуркаў, а гэта ўсё, што засталося ад пачатковага храма.

Пазітыўным прыкладам з'яўляецца вопыт археалагічнага вывучэння Спаса-Праабражэнскай царквы Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра, па гэтым помніку архітэктуры ў параўнанні з іншымі з 2005 г. атрымана максімальна поўная інфармацыя з улікам магчымасцяў сучасных метадаў даследавання. Адзначым таксама, што рэшткі будынку ратушы наўрад ці будуць археалагічна даследаваны ў бліжэйшай перспектыве: на месцы ратушы двойчы быў узведзены будынак (спачатку дом генерал-губернатара ў канцы XVIII ст., які пасля разбурэння зноў быў адноўлены). На месцы полацкага рынка з крамамі і яткамі XVII–XVIII стст. размешчана гарадская плошча, і патэнцыйна гэтая тэрыторыя можа быць археалагічна даследавана. Аднак і тут не ўсё адназначна, паколькі ў XIX ст. усходняя частка плошчы была забудавана цаглянымі будынкамі і частка культурнага пласта была моцна пашкоджана.

Эўрыстычныя магчымасці пісьмовых крыніц у рэканструкцыі побыту палачан даволі значныя і ахопліваюць розныя аспекты жыццядзейнасці: харчаванне, хатняе ўладкаванне, выгляд інтэр'ера, асаблівасці канструкцый падвор'яў і падворкавай забудовы, матэрыяльныя каштоўнасці і іх зберажэнне. Асаблівасці аддзення, тканіны і іх выкарыстання ў розных мэтах застаецца безумоўным прыярытэтам пісьмовых крыніц, паколькі археалагічныя артэфакты прадстаўлены літаральна адзінкамі. Тое ж тычыцца рэчаў "цынавых": дарагога посуду і сталовага начыння, якія самі па сабе з'яўляліся аб'ектам захавання каштоўнасцяў. Асноўныя катэгорыі зброі і каштоўных упрыгажэнняў з золата і серабра, асобныя рамесныя інструменты і іх выкарыстанне, "катлы гарэлачныя", назвы пабудоў у залежнасці ад іх прызначэння з'уляюцца безумоўным прыярытэтам пісьмовых крыніц. А вось знешні выгляд печаў і іх канструкцыя, прызначэнне і склад жалезных дэталяў дзвярэй і вокнаў, асобныя сюжэты роспісаў і рэльефныя сюжэтныя выявы на металічных і керамічных рэчах паводле археалагічных артэфактаў дазваляюць раскрыць многія аспекты жыццядзейнасці і ўяўленняў палачан.

Калі спрабаваць вызначыць прыярытэты ў пашырэнні крынічнай базы, то безумоўную перавагу неабходна прызнаць за археалагічнымі крыніцамі. Пашырэнне крынічнай базы за кошт пісьмовых дакументаў XVII–XVIII стст. магчыма, але значна абмежавана. Большасць кніг полацкага магістрата



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

страчаны назаўжды, таму прыярытэт застаецца ў пошуку іншых пісьмовых дакументаў, напрыклад, па гісторыі езуіцкага калегіума ў Полацку. З іншага боку, вывучаная плошча культурнага пласта Полацка разглядаемага перыяду, нават з улікам яго пашкоджанняў падчас гаспадарчай дзейнасці, дазваляе ўпэўнена сцвярджаць аб наяўнасці патэнцыйна шырокай крынічнай базы для даследавання. А значыць, прыярытэт археалагічных крыніц яшчэ доўга будзе заставацца безумоўным.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г. : зб. дакл. / НАН Беларусі ; Ін-т гісторыі; склаў і падрыхтаваў да друку М. Ю. Гардзееў. – Мінск : Беларуская навука, 2006. – 270 с.: іл.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова